Ці паслала ты, Анечка, картку Язэпу? Я яму яшчэ не адказваў, чакаю ад цябе ліста і калі ты пашлеш яму картку.

Напішы ты Марылі. Нешта ня піша нічога Ўладзік гэтым часам. Адрас вазьмі ў Ганны.

Лорачка і Лялячка, я Вам паслаў кніжкі. Напішыце, як прачытаеце, ці цікавыя, што ў іх Вам спадабалася і што не, ці ўсё зразумела ў іх. Прыяжджайце калі да мяне. Як бы я рад быў. Толькі як будзеце ехаць, напішыце калі, каб я мог сустрэць Вас. Цалую Вас моцна.

Ваш *Адзік*.

Калі ніякай сьпешнай работы не нарвецца на 6 сакавіка, дык пастараюся наведацца да Вас.

Анечка, ты нічога не напісала, як у цябе з школай, як дачыненьні.

Вельмі хочацца дадому, бачыць Вас, гаварыць з Вамі. Сумна мне тут бяз Вас.

*Адзік*.

## № 94. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*5.III.1935*

Дарагія Анечка, Лорачка і Лялячка!

Вы, пэўна, мяне чакаеце сёньня. Але я атрымаў на сваю заяву ў шэфаў адказ і таму не прыеду. Чакацьму Вас усіх траіх пасьля 20 сакавіка, як у Вас будуць вакацыі.

Ліст твой сёньня атрымаў. Як я рад, што Лорачка ў нас такая разумніца. Лялячка таксама малайчына. Напішу сёньня Вам лісты ўсім. Гэту лістоўку хачу ўкінуць у цягнік, а ўжо час позьні.

На службе яшчэ дакладна ня выясьнена маё становішча.

Любыя мае, чакаю Вас да сябе.

Моцна цалую Вас.

*Адам*.

## № 95. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*6.III.1935 г.*
*[Киров]*

Любая Анечка!

Меўся я сёньня быць у Вас, дык ня адважыўся йсьці супроць шэфскай забароны паехаць у Слабадзкі. Хоць, зрэшты, гэтая забарона зусім бязглуздая і недарэчная і сьведчыць толькі аб тупой жорсткасьці таго, хто гэтую забарону ўчыніў. Сама па сабе гэтая забарона ня варта таго, каб зьвяртаць на яе ўвагу. Але тое, чым і як яна была абстаўлена, вымушае яе расцэньваць як акт „булавочного укола“ тупога чынушы.

Учора а гадзіне 12–ай я пазваніў у НКВД і выклікаў да тэлефону нейкага Сьвечнікава. Прасіў я яго дазволіць мне паехаць на адзін дзень у Слабадзкі да сям’і. Ён адказаў, што гэтага пытаньня вырашыць так ня можа, што трэба, каб я сам прышоў туды. Пасьля работы я пашоў у камэндатуру і перадаў сваю просьбу дзяжурнаму камэнданту. Той пазваніў зноў таму ж Сьвечнікаву. Гэты загадаў, каб я